**УДК 655.11 (4765-21)**

# ГАЗЕТА «ПОЛОЦКИЙ ПАХАРЬ» ЯК З'ЯВА Ў ГІСТОРЫІ ПЕРЫЯДЫЧНАГА ДРУКУ ПОЛАЧЧЫНЫ

***Д. А. КАШКУР***
***(Прадстаўлена: канд. гіст. навук, дац. А. В. СУМКО)***

*У артыкуле прадстаўлены агляд акруговай газеты «Полоцкий пахарь», ахарактарызавана дзейнасць рэдакцыі, прааналізаваны змест газеты.*

На хвалі ўзнаўлення гаспадаркі і стабілізацыі палітычнай абстаноўкі, якая адбылася ў першай палове 1920-х гг., у савецкай краіне была створана асобная сетка дзяржаўных грамадска-палітычных газет, якія не толькі прапагандавалі камуністычныя ідэі сярод насельніцтва, але і задавальнялі патрэбы чытачоў у атрыманні актуальнай інфармацыі. Часы НЭПа і гаспадарчага разліку вымагалі ад рэдакцый пошуку новых метадаў працы з аўдыторыяй дзеля пашырэння ўласнага рынку збыту. Гэтыя якасныя змены закранулі не толькі цэнтральныя гарады, але і акруговыя. Адным з такіх гарадоў у БССР у выніку ўзбуйнення 1924 г. стаў і Полацк. Як і ў іншых беларускіх гарадах, тут пачала выпускацца мясцовая, а менавіта акруговая, газета – «Полоцкий пахарь», першы нумар якога выйшаў 16 верасня 1924 г.:

*«Сегодня выходит первый номер нашей газеты. Ее название «Полоцкий Пахарь» уже определяет содержание газеты. Крестьянская, она будет главное внимание обращать на отражение всех сторон жизни и быта деревни… Агроном, врач, ветеринар, врач, судья, учитель, кооператор будут главными сотрудниками корреспондентами, через них на все «наболевшее» крестьянин получит ответ…» [1, с. 1]*

Доўгі час даследчыкі апісвалі «Полоцкий пахарь» як рускамоўнае выданне [2, с. 38; 3, с. 154], але падчас нашага непасрэднага вывучэння газеты, ў ёй была выяўлена вялікая колькасць артыкулаў на беларускай мове. Такім чынам, мы лічым, што «Полоцкий пахарь» з'яўляецца першай полацкай газетай, дзе выкарыстоўвалася беларуская мова. Ужыванне апошняй у перыёдыцы стала магчыма на хвалі беларусізацыі, але трэба таксама дадаць, што выкарыстанне беларускай мовы было абумоўлена яшчэ і тым, што менавіта дадзеная газета ўпершыню сярод полацкіх перыядычных выданняў вызначыла сябе як сялянскую газету.

Напачатку «Полоцкий пахарь» выходзіў 2 разы на тыдзень (па серадах і суботах [4, с. 1; 5, с. 1]) звычайна на 4, радзей на 6 старонках і з'яўляўся органам Полацкай акркама КП(б) Беларусі і акрвыканкама [3, с. 154]. Рэдакцыя газеты, як і амаль кожная рэдакцыя краіны ў гэты час, дзейнічала ў вельмі складаных умовах: не хапала абсталявання, добрага памяшкання і працоўных кадраў. Гэта не магло не адбіцца на якасці газеты: з-за бясколернасці шрыфтоў, тэхнічных недахопаў цікавасць да яе з боку шырокага кола чытачоў гублялася. Але пастунова сітуацыя мянялася ў лепшы бок, а ўмовы працы паляпшаліся. Рэдактар «Полоцкого пахаря» неаднаразова на працягу 1925 г. звяртаўся да гарадскіх улад з патрабаваннем памяшкання для рэдакцыі газеты. Атрымаўшы яго (верагодней за ўсё, зараз гэта дом №6 на вул. Войкава), рэдакцыя і друкарня сталі працаваць у адным месцы. Калі ж ў рэдакцыі з'явіліся дадатковыя грошы, пры ёй адкрылася крама пісьмовых тавараў, а таксама было набыта новае абсталяванне для друкарні. Павелічэнне прыбытку на хвалі паляпшэння ўмоў працы павінна было, па прагнозах рэдакцыі, зменшыць кошт на газету і такім чынам забяспечыць ёй пашырэнне кола чытачоў [2, с. 38–39]. Але, безумоўна, галоўную ролю ў хуткім распаўсюджванні газеты сярод насельніцтва адыграла якасць яе зместу. Так з'яўленне вялікай колькасці інфармацыі ў газеце, якая была цікавай і карыснай для сялян Полацкай акругі, дазволіла павялічыць колькасці падпісак на «Полоцкий пахарь» ў 3 разы [6].

Акруговая газета мела выразны тэматычны падзел. Першая старонка «Полоцкого пахаря» складалася з трох асноўных частак, дзе змяшчалася наступная інфармацыя:

- Дэкрэты, цыркуляры, распараджэнні, якія датычыліся ўсёй краіны, радзей толькі акругі; дзяржаўныя святы.
- Навіны па розных краінах Савецкай рэспублікі.
- Навіны сусветнага маштабу.

Пры чым рэдакцыя вызначала гэтую старонку, як «сухую». Асноўным жа прызначэннем перыферыйных газет яна лічыла асвятленне мясцовых пытанняў, чаму і прысвяціла ўсе наступныя старонкі, дзе размяшчалася разнастайная інфармацыя па самых розных сферах, якія непасрэдна датычаліся жыцця і гаспадаркі акругі. З'явіліся ў газеты і пастаянныя рубрыкі: «Савецкае будаўніцтва», «Зямельныя справы», «Сельское хозяйство»,«Кааперацыя», «Дела лесные», «На культурна-асветным фронце», «Письма крестьян», «Ответы крестьянам». Рубрыкі вяліся даволі вольна, не зводзіліся да фармальнай падачы дадзеных. Напрыклад, у рубрыцы «Кааперацыя» не толькі прадстаўляліся звесткі пра

гэтую форму працы і даводзілася пра яе карысць, тут жа рэдакцыя адзначала стаўленне мясцовага насельніцтва да яе:

*«У рэдакцыю штадня паступае шмат лістоў пра кааперацыю… амаль што выключна пішуць пра цёмныя бакі кааперацыйнай працы…» [7]*

Газета не ігнаравала думкі насельніцтва наконт розных новаўвядзенняў, яна стала месцам дыялогу паміж чытачамі і ўладамі. Гэта бачна са зместу шматлікіх артыкулаў, у якіх асвячаліся праблемы, што турбавалі жыхароў акругі і якія яшчэ чакалі вырашэння:

*«Прыёмны пакой у Валынцах змяшчаецца у адным пакоі. Тут хворыя чакаюць агляду, тут жа доктар робіць агляд хворых і тут жа прыгатаўляюцца лекі. Лавак у пакоі няма, так што хворыя чакаюць стоячы. Трэба было б прыняць меры для абсталявання пакою…» [8]*

У гэтым жа нумары апублікавана патрабаванне сялян да лясніцтва заплаціць за працу, рэдакцыя ў сваю чаргу стварыла спецыяльны верш з пазначэннем прозвішчам кіраўніка гэтай арганізацыі, дзе жартаўліва пагражала яму, верш аздабляўся гумарыстычнай ілюстрацыяй [9].

Асобныя раздзелы газеты змяшчалі пытанні чытачоў (звычайна пра правы і абавязкі, асабліва пра грашовыя падаткі ці сацыяльныя выплаты) і адказы рэдакцыі на іх. Кожны дзень за даведкамі ў рэдакцыю звярталася каля 10 чалавек. Газета дапамагала некаторым сялянам паменшыць падаткі ці зняць іх увогуле. Зарэгістравана 40 выпадкаў, калі газета дапамагла змяніць вынікі пастаноў акружных, раённых і сельскіх органаў на карысць насельніцтва [10]. Такім чынам газета зарабіла рэпутацыю арганізацыі, што аказвала пасільную дапамагала насельніцтву акругі, якая не ігнаравала запыты чытачоў, выкрывала несправядлівасць, вырашала супярэчнасці і канфлікты.

У рубрыцы «На культурна-асветным фронце» асвячалася пытанне адукацыі і ліквідацыі непісьменнасці, пры чым пераважна ў рэчышчы беларусізацыі. Рэдакцыя спасылалася на меркаванні настаўнікаў і прапагандавала адукацыю на беларускай мове «бо дзеці ёю вельмі цікавяцца, ды яна для іх свая, родная, знаёмая» [11]. Газета несла культуру ў масы праз падтрымку таленавітых чытачоў і публікацыю іх вершаў на сваіх старонках, аналіз жа вершаў, якія прыйшліся рэдакцыі не даспадобы, аналізаваліся ў рубрыцы «Нашим поэтам», тут жа даваліся рэкамендацыі па паляпшэнню якасці твораў.

Менавіта на старонках «Полоцкого пахаря» з’явіліся звесткі пра краязнаўчы рух на Полаччыне, працу краязнаўчага гуртка, што быў створаны ў сакавіку 1925 г. [12]. Ад гуртка патрабавалася сабраць, апрацаваць і выдаць матэрыял па вывучэнню акругі [13]. У тым жа годзе ў Полацку быў выпушчаны гісторыка-эканамічны нарыс «Полотчина».

Да культурнага пытання рэдакцыя «Полоцкого пахаря» падыходзіла сістэмна: яна не толькі спрыяла распаўсюджванню адукацыі і навукі, а таксама прапагандавала новую культуру, але і працавала супраць «забабонаў», выкрывала папоў і знахароў, якіх называла «братамі»:

*«У Ветрынскім раёне ёсць шаптун Каменка. Шаптаў ён мінулаю зімою на хлеб, каб вылячыць ад шаленства сабак. Вядома, што сабак прышлося застрэліць, і добра яшчэ, што людзей не пакусалі…» [14]*

Не абмінала газета пытанне аховы здароўя, тут мелася рубрыка мясцовага ўрача. Яшчэ часцей на старонках выдання выступалі ветэрынары і аграномы, якія праводзілі лікбез па пытаннях гадавання свойскай жывёлы.

Асобнае месца ў газеце займала рэклама, якая пашырылася на хвалі НЭПа. Яна размяшчалася на апошняй старонцы «Полоцкого пахаря» і афармлялася асобнымі рамкамі. Рэкламаваліся прадукты полацкага цэнтральнага рабочага кааператыва, цэнтраземсклада, аптэчная прадукцыя, страхавыя і банкаўскія паслугі, таргі, падпіска на газеты, прадукцыя полацкай пякарні, сталовай, малочнай лаўкі, лато. Рэкламаваўся нават алкаголь [15, с. 4; 16, с. 4], што не замінала супрацьалкагольнай агітацыі амаль у кожным нумары. Газета рэкламавала і паслугі сваёй друкарні, у №33 прапанавала ўсім прадпрыемствам горада з мэтай рэкламы сваёй прадукцыі паўдзельнічаць у выпуску «Торгово-промышленного плаката в красках» у колькасці 7500 экзэмпляраў, якія прапанавалася распаўсюджваць ў Полацку, а таксама ў рэкламных канторах Віцебска, Мінска, Масквы і Ленінграда [17, с. 4] У нумары за 24 чэрвеня 1925 г. рэдакцыя газеты «Полоцкий пахарь» абвясціла аб хуткім адкрыцці свайго пісча-папяровага магазіна. Тавары ў ім павінны былі прывозіцца з Масквы і Ленінграда, а мясцовая друкарня павінна была рабіць для магазіна канторскія і бухгалтарскія, талонныя і квітанцыйныя кнігі [18, с. 6]. Рэдакцыя прапанавала крэдыты мясцовым установам. Акрамя таго друкарня газеты «Полоцкий пахарь» выконвала па запыце гараджан друкарскія і пераплётныя работы [19, с. 6].

Акрамя асноўнага зместу і звыклых рубрык «Полоцкий пахарь» меў асобныя тэматычныя старонкі: полацкая ячэйка ЛКСМБ з №15 вяла ў «Полоцком пахаре» рубрыку «Юный пахарь», а з 1925 г. у газеце з’явілася асобная камсамольская старонка, што набыла назву «Вясковая камсамолія» [2, с. 38]. Апошняя нумаравалася асобна і выходзіла адзін раз на тыдзень, на 3 ці 4 старонцы «Полоцкого пахаря». Гэтая тэматычная старонка асвячала вясковае пытанне па асобных раёнах акругі, а таксама публікавала

вершы сяброў «Маладняка», тут жа аб працы гэтага аб'яднання распавядаў у сваіх артыкулах Алесь Дудар [20].

Пад кіраўніцтвам новага рэдактара «Полоцкого пахаря» М. Табінскага вакол газеты быў разгорнуты селькораўскі рух. Калі восенню 1924 г. у газеце працавала каля 50 селькораў, то вясной 1925 г. іх колькасць павялічалася да 125 [10]. Акрамя прыцягнення да працы селькораў, рэдакцыя «Полоцкого пахаря» падтрымлівала зацікаўленых у развіцці газетнай справы ў акрузе, для чаго арганізоўвала конкурсы насценгазет [21]. Адзін з артыкулаў полацкай газеты змяшчае ў сабе патрабаванні да насценгазет: яркае апісанне мясцовага жыцця і аздабленне матэрыялу карыкатурамі, пры чым адзначалася, што асвячэнне сусветных навін і палітыкі застаецца выключна за акруговай газетай [22].

Рэдакцыю «Полоцкого пахаря» цікавіла і пашырэнне тэрыторыі распаўсюджання ўласнага выдання. Так яе асобная рубрыка «Наши вызовы» была прысвечана арганізацыі падпіскі, што была аформлена ў якасці эстафеты: адзін чалавек выпісваў газету для сялян пэўнай вёскі, апавяшчаў аб гэтым рэдакцыю і ўказваў прозвішча таго, каго выклікаў працягнуць справу.

Сведчаннем пашырэння цікавасці да «Полоцкого пахаря» з боку чытачоў з'яўляецца тыраж: калі ў пачатку выдання газета выходзіла ў колькасці 1500 экзэмпляраў [10], на піку папулярнасці тыраж дасягнуў 7500 экзэмпляраў [23, с. 6]. Пры гэтым напачатку выпуску газеты палова экзэмпляраў выдання заставалася ў горадзе, а другая палова разыходзілася па акрузе, а ўжо з цягам часу з павелічэннем колькасці экзэмпляраў газеты – 4/5 тыражу адсылаліся за межы горада [10]. Такое размеркаванне сведчыць аб дасягненні пастаўленай рэдакцыяй «Полоцкого пахаря» мэты – стаць сялянскай газетай.

З самага пачатку «Полоцкий пахарь» вызначаў сябе як газету сялянскую, а яго рэдакцыя зрабіла шмат для таго, каб гэтае вызначэнне сапраўды атаясамлівалася з выданнем: за паўгода існавання газеты было надрукавана больш за 100 артыкулаў на тэму сельскай гаспадаркі, за 4 месяцы 1925 г. рэдакцыяй было падрыхтавала больш за 200 адказаў на пытанні насельніцтва вёскі Але паварот да сельскага насельніцтва акругі меў і адмоўны бок для газеты: страчваўся цэлы пласт патэнцыяльных чытачоў – гараджан. Апошнія не хавалі сваёй незадаволенасці і выказвалі свае пажаданні рэдакцыі, аб чым сведчыць адзін з водгукаў, што быў размешчаны ў №39 за 1925 г.:

*«Газете следовало хотя бы раз в две недели или месяц выпускать страничку «Профессиональная жизнь…» [24]*

Тут жа чытач вызначыў праблему, якая закранула не толькі мясцовую газету, але і многія беларускія гарады: ва ўмовах перавагі яўрэйскага і рускага элемента сярод гараджан з'явілася шмат незадаволеных палітыкай беларусізацыі:

*«Процентов 80 или даже больше читателей не знают белорусского языка, следует на белорусском языке печатать меньше…» [24]*

З другога боку, побач з такімі водгукамі размяшчаліся водгукі сялян, якім наяўнасць беларускай мовы на старонках газеты і ў сістэме тагачаснай адукацыі не замінала, а хутчэй дапамагала [11].

Для большай прывабнасці і лепшага разумення зместу «Полоцкого пахаря» дапаўняўся невялічкімі чорна-белымі ілюстрацыямі. Каштавала газета 4 капейкі [4, с. 1; 5, с. 1]. Падпіска на яе на 1 месяц абыходзілася ў 32 к., на 3 – 90 к. [4, с. 1], пазней – 25 к. і 70 к. адпаведна [5, с. 1]. Да прыкладу адзін фунт цукру ў Полацку каштаваў 27 к., 1 пуд ржаной мукі – 1 р., 90 к. [25]. З 2 лютага 1926 г. газета выходзіла пад новай назвай «Чырвоная Полаччына» [3, с. 154].

Тэматычны падзел і традыцыі, закладзеныя рэдакцыяй «Полоцкого пахаря» захоўваліся да 1930 г. і былі адрынуты не з прычыны іх нежыццяздольнасці, а з-за змена палітычнага курсу і новых патрабаванняў да перыядычнага друку. Выданне газеты «Полоцкий пахарь» – гэта час росквіту полацкай газеты, час яе ўздыму. Са старонак «Полоцкого пахаря» пачаўся шлях шматлікіх беларускіх пісьменнікаў, дзякуючы якім была заснавана полацкая літаратурная школа, часткова іх заслугай стаў і пачатак выкарыстання беларускай мовы на старонках полацкіх выданняў. З аднаго боку, «Полоцкий пахарь» з'яўляецца месцам вытоку краязнаўчага руху, з другога, ён сам стаў цікавым летапісам па гісторыі Полацка, тут можна знайсці шмат інфармацыі пра жыццё горада, пра яго палітычнае, эканамічнае, сацыяльнае і культурнае развіццё.

ЛІТАРАТУРА

1. Полоцкий пахарь. – 1924. – 16 сент.
2. Воднева, І.П. Перыядычны друк на Полаччыне ў першай палове XX ст. (1917–1936) / І.П. Воднева // Матэрыялы гісторыка-краязнаўчай канферэнцыі: да 80-годдзя Полацкага Краязнаўчага музея, Полацк, 22–23 ліст. 2006 г. / уклад. В.Д. Краско. – Полацк: НПГКМЗ, 2008. – С. 33–42.
3. Газеты Беларусі 1776–1975: бібліяграфічны паказальнік / склад. Л.М. Няхайчык [і інш.]. – Мінск: Нацыянальная кніжная палата Беларусі, 2003. – 322 с.

4. Полоцкий пахарь. – 1925. – 14 март.
5. Полоцкий пахарь. – 1925. – 3 окт.
6. Зьніч, А. Выказвайцеся аб нашай газэце / А. Зьніч // Полоцкий пахарь. – 1925. – 15 апр. – С. 2.
7. Зьніч, А. Менш лаянкі / А. Зьніч // Полоцкий пахарь. – 1925. – 18 март. – С. 3.
8. Зоркі. Без абсталявання / Зоркі // Полоцкий пахарь. – 1925. – 14 март. – С. 2.
9. Треплют лапти // Полоцкий пахарь. – 1925. – 14 март. – С. 3.
10. Икар. Наша газета в цифрах / Икар // Полоцкий пахарь. – 1925. – 9 мая. – С. 5.
11. Лубоўскі, Я. Асьветная праца ў Дрэтуньскім районе / Я. Лубоўскі // Полоцкий пахарь. – 1925. – 14 март. – С. 2.
12. Радня. Сьпіць / Радня // Полоцкий пахарь. – 1925. – 28 апр. – С. 3.
13. По докладу отдела народного образования // Полоцкий пахарь. – 1925. – 25 апр. – Приложение «Резолюции 12-го С’езда Советов Полоцкого округа». – С. 2.
14. Дудар, А. А вось пра папоў і знахароў / А. Дудар // Полоцкий пахарь. – 1925. – 25 март. – С. 2.
15. Полоцкий пахарь. – 1925. – 21 март.
16. Полоцкий пахарь. – 1925. – 28 апр.
17. Полоцкий пахарь. – 1925. – 25 апр.
18. Полоцкий пахарь. – 1925. – 24 июн.
19. Полоцкий пахарь. – 1925. – 1 апр.
20. Дудар, А. За новую культуру / А. Дудар // Полоцкий пахарь. – 1925. – 8 апр. – С. 3.
21. Д.Х. К конкурсу стенных газет / Д.Х. // Полоцкий пахарь. – 1925. – 18 март. – С. 5.
22. Стенная газета и ее значение // Полоцкий пахарь. – 1925. – 21 март. – С. 2.
23. Полоцкий пахарь. – 1925. – 18 март.
24. Чуткий, С. Что говорят о «Пахаре» крестьяне / С. Чуткий // Полоцкий пахарь. – 1925. – 15 мая. – С. 4.
25. Цены на товары церабкома // Полоцкий пахарь. – 1925. – 21 март. – С. 4.